***А.Я. Паўлава,*** *дацэнт*

# КРЫНІЦАЗНАЎЧЫЯ ТРАДЫЦЫІ І СТРАТЭГІІ Ў БЕЛАРУСІ

У апошнія гады назіраецца вялікая цікавасць да праблем крыніцазнаўства гісторыі Беларусі. Аднак дагэтуль не з'явілася ніводнага значнага даследавання па гісторыі крыніцазнаўства ў Беларусі. Праблемам гісторыі айчыннага крыніцазнаўства прысвечаны толькі невялічкія параграфы ў навучальных дапаможніках і адзінкавыя артыкулы ў часопісах. Між тым крыніцазнаўства ў Беларусі мае даволі багатыя традыцыі.

Увогуле дзейнасць даследчыкаў у галіне крыніцазнаўства можна падзяліць на тэарэтычную (даследаванне праблем тэорыі і методыкі крыніцазнаўства, а таксама адукацыі ў галіне крыніцазнаўства) і практычную (пошук, выданне і вывучэнне крыніц). Менавіта з гэтага пункту гледжання і прааналізуем даследаванні ў беларускім крыніцазнаўстве.

Гістарычна склалася так, што развіццё крыніцазнаўства цесна звязана з архіўнай справай і археаграфіяй. Значны ўклад у падмурак практычнага беларускага крыніцазнаўства зрабіў М.Кромер, які склаў вопіс аўтэнтычных лістоў (з Літоўскай метрыкі), калі праводзіў вопісы дакументаў з канцылярыі ВКЛ па загаду Л.Сапегі. З XVII ст. актыўна рабіліся вопісы прыватных бібліятэк і архіваў. Такім чынам, прыгаданую працу можна аднесці да першых спроб сістэматызацыі крыніц [5].

Аднак актыўнае развіццё крыніцазнаўства, перш за усё ў кірунку эўрыстычнай і археаграфічнай дзейнасці, пачынаецца ў Беларусі ў XIX ст. Пачаткам эдыцыйнай археаграфіі стаў двухтомны зборнік “Пераканальная лаціна, або Збор рыторыкі, лістоў, статыстыкі, палітыкі, надпісаў, панегірыкаў, паэтыкі і гісторыі”, складзены сакратаром пінскага дыстрыкта ордэна айцоў марыянаў Я.Д.Астроўскім.

Крыніцы па гісторыі шукалі і даследавалі галоўным чынам археаграфічныя экспедыцыі. Удзельнікам гуртка графа Н.П.Румянцава з'яўляўся вядомы археограф І.Грыгаровіч. У 1824 г. па іх ініцыятыве быў выдадзены першы том “Беларускага архіва старажытных грамат”. Планавалася выдаць тры тамы, аднак другі том застаўся ў рукапісах, а трэці нават не быў цалкам падрыхтаваны [6].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У зборы і вывучэнні гістарычных крыніц прымалі ўдзел выпускнікі і выкладчыкі Віленскага універсітэта. Іх плённая праца заклала падмурак увядзення ў навуковае абарачэнне невядомых дагэтуль помнікаў. Так, яшчэ ў студэнцкія гады І.Даніловіч сур'ёзна зацікавіўся пытаннямі вывучэння пісьмовых крыніц. Ён адшукаў Судзебнік Казіміра і выдаў яго ў 1826 г. Папулярнасць І.Даніловіча к 1840-м гг. дазволіла яму лёгка атрымліваць доступ у архівы, бібліятэкі, музеі многіх універсітэцкіх гарадоў. Менавіта І.Даніловіч упершыню апісаў усе рукапісныя і надрукаваныя экзэмпляры Статута ВКЛ 1529 г. [1]. І.Анацэвіч адным з першых заняўся гісторыка-тапаграфічным апісаннем краю. Ён сабраў багатыя калекцыі дакументаў па выніках сваёй працы ў архівах Беларусі, Літвы, Польшчы і Расіі [4].

У сярэдзіне XIX ст. у расійскай імперыі ствараюцца Археаграфічная камісія пры Міністэрстве народнай асветы, шэраг мясцовых камісій (у тым ліку і Віленская), а таксама Віленскі і Віцебскі архівы старажытных актаў. Усе яны актыўна садзейнічалі адшуканню, выданню і вывучэнню гістарычных крыніц. Толькі Віленская археаграфічная камісія з 1865 г. па 1915 г. выдала 39 тамоў актаў.

Пачатак выкладання крыніцазнаўства на універсітэцкім узроўні таксама звязаны з Віленскім універсітэтам. Менавіта тут у першай палове XIX ст. прафесар Іаахім Лялевель чытае і выдае курс лекцый па крыніцазнаўстве і дапаможных гістарычных дысцыплінах "Навукі, якія дапамагаюць вывучаць гістарычныя крыніцы". У кнізе распрацавана аўтарская метадалогія гісторыі. Такім чынам, выкладанне крыніцазнаўства на Беларусі мае больш старажытныя карані, чым нават у Францыі ці Расіі.

У 1920-я гг. крыніцазнаўства стала развівацца больш актыўна. У 1921 г. утвараецца БДУ. Першым рэктарам У.І.Пічэтам быў распрацаваны курс "Уводзіны ў вывучэнне гісторыі БССР", у межах якога студэнты знаёміліся з асновамі крыніцазнаўства: падаваліся класіфікацыя і характарыстыка асноўных груп крыніц. Менавіта ў гэты час М.Доўнар-Запольскі вывучае гаспадарчыя апісанні, мытныя кнігі, "Баркулабаўскі летапіс" і Літоўскую метрыку.

Асобнае месца сярод пачынальнікаў крыніцазнаўства на Беларусі належыць дацэнту БДУ Д.І.Даўгялу. Пры яго ўдзеле ў 1927–1930 гг. выдаюцца тры тамы "Беларускага архіва", а ў 1933 г. у Рызе – праца "Літоўская метрыка і яе каштоўнасць для вывучэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мінулага Беларусі”. Вялікую значнасць Д.І.Даўгяла надаваў пытанням рэстытуцыі культурных каштоўнасцей. Вядома бліскучая прамова яго на Першым з’ездзе прадстаўнікоў беларускай археалогіі і археаграфіі [6]. Менавіта Д.І.Даўгяла чытаў у сярэдзіне 1920-х гг. у БДУ дысцыпліны “Крыніцы і крыніцазнаўства гісторыі Беларусі” і “Гісторыя крыніцазнаўства Беларусі”. У азначаныя гады і быў закладзены падзел курса на дзве часткі: тэарэтычную і практычную. Даволі значную частку курса Д.І.Даўгяла прысвячаў праблемам правільнага выдання крыніц, што значна палягчала б працу гісторыкаў [2]. На жаль, рэпрэсіі 1920–30-х гг. на пэўны перыяд прыпынілі багатыя класічныя традыцыі развіцця крыніцазнаўства, перш за ўсё ў БДУ. Больш сур’ёзна да выкладання крыніцазнаўства звярнуліся ў 1978 г., калі на гістарычным факультэце БДУ курс па крыніцазнаўстве гісторыі Беларусі пачаў выкладаць А.П.Ігнаценка [3].

У пасляваенны перыяд не спыняліся даследаванні ў галіне крыніцазнаўства. Сярод пытанняў, якія цікавілі даследчыкаў, трэба пазначыць наступныя: беларуска-літоўскае летапісанне, гаспадарчыя і справаводчыя дакументы перыядаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай, мемуары і запіскі падарожнікаў. Плённа працавалі М.М.Улашчык, В.А.Чамярыцкі, П.Г.Казлоўскі, З.Ю.Капыскі, А.І.Мальдзіс, В.П.Грыцкевіч, А.Ф.Коршунаў і інш.

З канца 1980-х гг. у сувязі з ростам цікавасці менавіта да нацыянальнай беларускай гісторыі адбываецца і актывізацыя даследаванняў у галіне крыніцазнаўства. У Інстытуце гісторыі НАН Беларусі ствараецца аддзел спецыяльных гістарычных даследаванняў, на гістарычным факультэце БДУ – кафедра крыніцазнаўства, гісторыкі выкарыстоўваюць метады іншых навук для вырашэння праблем крыніцазнаўства, штогадова праводзяцца навуковыя канферэнцыі па праблемах крыніцазнаўства, пачынаецца падрыхтоўка першых вучэбных дапаможнікаў.

На працягу апошніх двух дзесяцігоддзяў былі выдадзены падручнікі С.Марозавай (па крыніцазнаўстве пісьмовых крыніц), М.Ф.Бандзелікава (па тэорыі і методыцы крыніцазнаўства), С.М.Ходзіна (гісторыка-генетычнае і кампаратыўнае даследаванне крыніц па гісторыі Беларусі) і інш. Асноўнымі цэнтрамі адукацыі ў галіне крыніцазнаўства з’яўляюцца БДУ, БДПУ і Полацкі універсітэт. Такім чынам, славутыя традыцыі, распачатыя ў Віленскім універсітэце амаль 200 гадоў таму, працягваюцца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Методыка і метадалогія крыніцазнаўства разглядаецца зараз у трох кірунках: класічным, інфармацыйным і культуралагічным. Асноўным у сучаснай культуралагічнай крыніцазнаўчай парадыгме з'яўляецца разуменне крыніцы як з'явы культуры, што прадугледжвае пераход ад традыцыйнага аналізу крыніцы да аналізу інтэлектуальнага. Адпаведна крыніцазнаўства становіцца метанавукай для ўсіх гуманітарных дысцыплін. Нягледзячы на цікавасць да праблем крыніцазнаўства ў Беларусі, тэарэтычныя пытанні крыніцазнаўства не сталі прадметам дэталёвага даследавання айчынных навукоўцаў.

Тым не менш у беларускім крыніцазнаўстве адзначаюцца даследаванні па большасці актуальных праблем:

– міждысцыплінарны сінтэз (даследчыкі: кафедра крыніцазнаўства БДУ – У.Н.Сідарцоў, В.А.Латышава, В.М.Шутава, Д.С.Самахвалаў і іншыя, а таксама гісторыкі БДПУ імя М.Танка М.Ф.Бандзелікаў і М.І.Мініцкі);

– камп'ютэрнае крыніцазнаўства (даследчыкі: аддзел спецыяльных гістарычных даследаванняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кафедра крыніцазнаўства БДУ – В.Л.Ліпніцкая, С.Б.Каун і інш.);

– архіўнае крыніцазнаўства (пададзена двума кірункамі: вывучэнне крыніц па гісторыі архіўнай справы ў Беларусі і крыніц па гісторыі Беларусі, даследчыкі: М.Ф.Шумейка, К.І.Казак, В.Д.Селяменеў, В.В.Скалабан, В.С.Іванова, А.М.Латушкін, Г.В.Запартыка і інш.);

– крыніцазнаўства актуальных праблем гісторыі Беларусі;

– вывучэнне асобных відаў крыніц (Рыбчонак, А.М.Бяляўскі).

Штогадовымі, пачынаючы з 1998 г., сталі Пічэтаўскія чытанні на гістарычным факультэце БДУ, аднаўлена дзейнасць Археаграфічнай камісіі, выдаюцца археаграфічны штогоднік і штогадовыя зборнікі "Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны". Цэнтральныя дзяржаўныя архівы вядуць вялізарную археаграфічную дзейнасць, ва ўсіх універсітэтах Беларусі студэнты гістарычных спецыяльнасцей вывучаюць курс крыніцазнаўства і інш.

Па-за межамі навуковых інтарэсаў даследчыкаў дагэтуль застаюцца гістарыяграфія айчыннага крыніцазнаўства і актуальныя пытанні музейнага крыніцазнаўства.

Такім чынам, можна канстатаваць, што развіццё крыніцазнаўства мае ў Беларусі багатыя карані, асабліва ў галіне выкладання. Тым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не менш існуе шэраг важных праблем, якія ўсё яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў.

---

1. *Жумарь, С.В.* Очерки истории архивного дела в Беларуси (XV в. – 1991 г.) / С.В.Жумарь, Д.В.Карев, М.Ф.Шумейко. – Мн.: БелНИИДАД, 1999. – С. 78–80.

2. *Жумарь, С.В.* Архивист и археограф Дмитрий Довгялло / С.В.Жумарь, М.Ф.Шумейко // Архивы и делопроизводство. – 1999. – № 1. – С. 46–51.

3. *История* и теория источниковедения. – Мн.: БГУ, 2008. – С. 86–89.

4. *Караў, Д.* Пачаткі беларускага крыніцазнаўства / Д.Караў // Спадчына. – 1994. – № 1. – С. 4–14.

5. *Крыніцазнаўства:* вучэб. дапам. – Полацк: Полацкі дзярж. ун-т, 2006. – С. 62–64.

6. *Шумейко, М.Ф.* Археография / М.Ф.Шумейко. – Мн.: БГУ, 2005. – С. 131–138.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ